УДК 130+796.0.071.5.073

***Ул.П.ЛЮКЕВІЧ***

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ АСПЕКТЫ ДЭВІЯНТНЫХ ПАВОДЗІН У СУЧАСНЫМ СПОРЦЕ

Па заканчэнні XX ст. смела можна сцвярджаць, што яно прайшло пад «зоркаю» спорту. Спорт як сацыякультурны феномен сучаснасці захапіў, здаецца, усе сферы чалавечай жыццёвай дзейнасці і надалей працягвае пашырацца па ўсіх магчымых накірунках. Спартыўнае жыццё, як падкрэслівае Ігнацы Фіўт (I.S.Fiut, 1994), падпала пад дамінанту дзвюх галоўных ідэяў – ідэі алімпійскага спорту і ідэі спорту чэмпіёнскага. Першае акрэсліваецца такімі варункамі і вартасцямі, якія сведчаць пра шляхетнае спаборніцтва паміж людзьмі. Істотным момантам тут з'яўляецца шлях мірнага змагання пры захаванні роўных шанцаў для ўдзельнікаў. Больш складанасцяў з характарыстыкай чэмпіёнскага спорту.

Гэтая ідэя створана нашай цывілізацыяй. Яна мае мала агульнага з алімпійскім спортам і скіравана перш за ўсё на рэкордныя вынікі. Сучаснага спартоўца можна параўнаць са старажытным гладыятарам, які павінен быў прафесійна забаўляць і супакойваць першасныя інстынкты чалавека. І невыпадкова натоўп дамагаўся – «panem et circensi» (хлеба і відовішчаў). У падставе ўсяго гэтага ляжыць капіталістычна-ліберальны падыход, які звязаны са свабоднай канкурэнцыяй і максімальнымі прыбыткамі, што, у сваю чаргу, мае апірышча на ідэі сацыял-дарвінізму, які бесперапынна абвяшчае пра вартасць «барацьбы за побыт» і «выжыванне найбольш прыстасаваных». Пры ўсім гэтым дадаецца, што ў такім падыходзе да спорту рэалізуюцца натуральныя прынцыпы жыцця. Неабходна таксама падкрэсліць, што за падобнага кшталту спаборніцтвамі стаяць велізарныя грошы і адначасова надзеі на каласальныя прыбыткі. Сучасны спорт усё бліжэй падыходзіць да такой сітуацыі, калі перамога паўстае не толькі як пажаданая мэта, а як мэта адзіная. Каб дасягнуць яе, можна выкарыстоўваць усе сродкі.

Аднак, гэта толькі адзін бок спартыўнай дзейнасці. Яна як такая не можа існаваць без аўдыторыі гледачоў, таму што спорт, перш за ўсё, – гэта відовішча. Падчас рэалізацыі дадзенага віду актыўнасці спорт выконвае такія свае функцыі, як сацыяльна-эмацыйная, сацыялізацыйная, грамадска-інтэгратыўная, палітычная, сацыяльнай мабільнасці, біялагічная і інш. (K.Heinemann, 1990). Праявы агрэсіўнасці ў спорце знаходзяць свой водгук у паводзінах заўзятараў. Яны імгненна рэагуюць на тыя ці іншыя акалічнасці спаборніцтваў, прычым гэтая рэакцыя часам мае яскрава выказаны дэструктыўны характар. Тут можна спаслацца на думку знакамітага аўстрыйскага філосафа Конрада Лоранца (K.Lorenz, 1975), які параўноўваў механізм падобных працэсаў у людзей і вышэйшых жывёлаў, што абапіраецца на суаднясенне дзвюх сілаў: агрэсіі і рытуалізацыі, якая тармозіць першую, у выніку чаго паўстае шэраг падстаў да сацыяльнай інтэграцыі, якія звязаны са складаным механізмам звычаяў у жывёл і ў людзей. Ля крыніц тут знаходзіцца «парламент інстынктаў» дадзенага гатунку жывых істот, што складае адпаведную пастаянную сістэму абароны і развіцця феномену жыцця. Такім

Могилевский государственный университет имени А. Кулешова

чынам, агрэсіўныя паводзіны чалавека не ёсць дэвіянтныя. Іншая справа, што яны дэтэрмінаваны культурай грамадства.

Тое, што агрэсіўныя паводзіны маюць старажытныя карані, якія ўзыходзяць з глыбінь чалавечай гісторыі, даводзіць Хасэ Артэга-і-Гасэт (Х.Ортега-и-Гассет, 1991). У сваёй прамове на сходзе прадстаўнікоў Нямецкага спартыўнага саюзу ў Дзюсельдорфе 06 лютага 1954 года ён прапанаваў канцэпцыю «значэння спорта ў нашым жыцці» і разгледзеў гэты феномен у трох паслядоўных набліжэннях: біялагічным, гістарычным і ўнутранай прыроды спорту. Цікавымі і адначасова грунтоўнымі падаюцца разважанні Х.Артэгі-і-Гасэта ў адносінах да ўзнікнення чалавечага грамадства. Ён выказвае наступную думку: «... мы бачым, што ўзнікненне чалавечага грамадства як такога ёсць нечым прама супрацьлеглым прыстасаванню да неабходнасці і патрэбы. Першае грамадства – гэта саюз юнакоў, што арганізаваны з мэтай выкрадання жанчын і ажыццяўлення іншых варварскіх вылазак. І значана больш, чым на парламент альбо на суровы бюракратычны ўрад, ён падобны на спартыўвы клуб! Менавіта гэта я меў на ўвазе, калі абвясціў, што ля вытокаў дзяржаўнасці знаходзіцца спорт».

Іспанскі філосаф прыводзіць прыклад, згодна з якім у пэўныя святы юнакі выходзілі са свайго «спартыўнага клубу» (пры гэтым пазначаецца, што пераступаць парог гэтага своеасаблівага «юнацкага інтэрнату» пад страхам смерці забаранялася не толькі жанчынам і дзецям, але нават і дарослым мужчынам) і пачыналі раскручваць у паветры прывязаны да канца жылы кавалак дрэва, што прыводзіла да з'яўлення магічнага гуку. Гэты гук прымушаў разбягацца жанчын і дзяцей. Ім было забаронена бачыць дзіўных танцораў, што ў хмяльным святочным узбуджэнні рыхтаваліся ў паход за чужымі дзяўчынамі. Невыпадкова воінскія строі супадалі ў іх са святочнымі строямі. У абодвух выпадках гэта маскі. Калі ж да гэтага дадаць меркаванне Х.Артэгі-і-Гасэта пра тое, што чалавек, – асабліва ў юнацкім узросце, – мае патрэбу для свабоднага выкіду той энэргіі, якая перапаўняе яго арганізм, – то атрымаем зусім закончаны партрэт сучаснага заўзятара спорту.

Пры правядзенні параўнальнага аналізу колішніх юнацкіх груповак з сённяшнімі, напрыклад, ангельскімі «фэнамі» (ад глагола to fan – літаральна «распальваць вайну, страсці»), футбольныя арганізацыі якіх лічацца амаль што самымі небяспечнымі ў Еўропе (гл., напрыклад, К.Мяло, 1987), то можна зафіксаваць наступныя паралелі. Аматары футболу аб'ядноўваюцца ў адпаведнасці з клубнай схільнасцю. Матч для іх – гэта свята, да якога яны спецыяльна рыхтуюцца, каб выкінуць залішнюю энэргію. Яны «накачваюцца» півам ці іншымі алкагольнымі напоямі, апранаюцца ў адмысловае адзенне (альбо колераў клубу, альбо накшталт рокераў), трымаюць у руках сцягі і іншую клубную атрыбутыку, выкрыкваюць лозунгі, якія часта гучаць нецэнзурна. Твары іх расфарбаваныя. Яны таксама збіраюцца «на вайну». Толькі гэта ўжо не паляванне на жанчын, як у часы першабытнага ладу, а рэалізацыя ўстаноўкі на дэструкцыю ў сучасным яе варыянце. Як падкрэслівае Барбара Карольчак-Бярнацка (B.Karolczak-Biemacka, 1994), паводзіны заўзятараў могуць быць параўнаны з псіхапаталагічнымі. Прыхільнік спорту перажывае тую ж самую сітуацыю спаборніцтва, што і ўдзельнікі змаганняў, з такой самай эмацыйнасцю, дзякуючы псіхадынамічным механізмам ідэнтыфікацыі. Напрыклад, італьянскі заўзятар абазначаецца як «tifoso», – дакладна – «хворы на тыфус».

Для сапраўднага балельшчыка дзень без размовы пра сваю любімую каманду, weekend без удзелу ў матчы, – гэта дарэмна страчаны час. Найгоршым перыядам для яго з'яўляецца перапынак у чэмпіянаце, перад усім – зімовы, які працягваецццца каля чатырох месяцаў. Летам, так званы «мёртвы сезон», паўзу

паміж першым і другім колам, яшчэ можна перажыць, таму што не паспелі знікнуць з памяці фрагменты папярэдніх гульняў, як надыходзіць працяг спаборніцтваў. Балельшчыкі падобна як футбалісты акумулююць энэргію перад тым, як узнаўляецца чарговы чэмпіянат. А найбольш нецярплівыя не пакідаюць свае любімыя каманды нават тады, калі ідзе падрыхтоўчы перыяд да сезону. Яны назіраюць за спарынгамі, ацэньваюць новых футбалістаў. Важным момантам для заўзятараў з'яўляецца таксама аналіз турнірнай табліцы, календара спаборніцтваў і новых супернікаў, а таксама тое «з кім гуляем», «дзе» і «калі»: неабходна нейкім чынам узгодніць праблемы з працай альбо вучобай. Іншае ўжо не мае такой значнай ролі: грошы знойдуцца, а расклад цягнікоў і аўтобусаў заўсёды пад рукой.

Некалі існавала адно акрэсленне для тых, хто прыходзіць на стадыён, каб падбадзёрыць сваю каманду – балельшчык. Сёння неабходна ўдакладніць, што маецца больш шырокае падзяленне на прыхільніка, фана і хулігана. У Польшчы, напрыклад, футбольных заўзятараў, якія вызначаюцца агрэсіўнымі паводзінамі, называюць яшчэ «шалікоўцамі», таму што яны вызначаюцца шалікамі клубных колераў (дарэчы, гэтых самых «шалікоўцаў» можна ўбачыць на кожным матчы брэсцкага «Дынама»: яны звычайна займаюць паўднёва-заходнюю трыбуну і называюць сябе «blue-white devils»). Асобная гаворка ідзе пра хулігана, які з'яўляецца прыкладам балельшчыка, для якога вынік гульні не мае аніякага значэння, а сам матч – толькі повад, каб кінуць петарду і распачаць бойку. У той жа Польшчы гэтым адрозніваюцца «групы падтрымкі» клуба «Crakovia» (Кракаў), якія выступаюць пад назвай «official hooligans». На Беларусі ў апошнія гады дурную славу маюць заўзятары мінскага «Дынама»: практычна ніводзін матч гэтай каманды не абыходзіцца без таго, каб на футбольнае поле не кідаліся петарды.

Як пазначае Аліцыя Гаронцы (Goracy A., 1998), нефармальна групы заўзятараў можна падзяліць на некалькі падгруп (пераважна на прыкладзе футболу, але не толькі): 1) шалікоўцы; 2) ultras; 3) hooligans; 4) animals і 5) звычайныя гледачы.

Шалікоўцы характарызуюцца перш за ўсё тым, што носяць шалікі (эмблемы, значкі) колераў сваёй любімай каманды. Футбольныя матчы для іх з'яўляюцца вялікім перажываннем, што яны даводзяць праз гарачую падтрымку свайго клубу, а перамогі альбо паражэнні западаюць глыбока ў памяць. Для hooligans галоўным лічыцца сутычка. Матч – гэта толькі размінка перад ёй, а вынік можа толькі ўдакладніць памеры акцыі і вызначыць тых людзей, супраць якіх будзе накіравана агрэсія. Да гэтай падгрупы адносяцца і гэтак званыя скіны. Каб стаць хуліганам, трэба выразняцца агрэсіяй, брутальнасцю, схільнасцю да боек з фанатамі ненавісных супернікаў, а таксама з паліцыяй. На іх думку, вартасць клубу вызначаецца сілай яго заўзятараў. Пра іх часта гавораць як пра баевікоў. Яны маюць сваю структуру, на чале якой знаходзіцца кіраўнік. Вернасць клубу, яго колерам, строям дэманструюць таксама ultras. Праўда, іх паводзіны даволі неадназначныя: то яны з'яўляюцца прыкладам у паводзінах – спяваюць, падтрымліваюць гульцоў, то ўвязваюцца ў бойкі і актыўна ўдзельнічаюць у хуліганскіх выхадках. Нарэшце, animals – фанаты без усялякіх прынцыпаў. Іх не прызнаюць іншыя балельшчыкі каманды, і пераважна менавіта яны вінаватыя ў нанясенні цяжкіх пабоеў, а нават і забойстваў.

У апошні час агрэсіўныя паводзіны спартыўных заўзятараў, перш за ўсё футбольных, перастаюць трактавацца як выключна хуліганскія. Гэта выказваецца ў тым, што падобнага роду дэвіянтныя паводзіны на спартыуных аб'ектах і па-за імі разглядваюцца як феномен універсальнага характару ў тым сэнсе, што выступае незалежна ад культурнай сістэмы, узроўню эканамічнага развіцця грамадства і яго палітычнага ладу. Але практычна ўсюды прымаецца тэза, якая звязвае

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

дэвіянтныя паводзіны з выразна падкрэсленымі крымінагеннымі характарыстыкамі, што мае сувязь з узнікненнем руху фанаў на брытанскіх стадыёнах на пачатку пяцідзесятых гадоў XX стагоддзя на падставе ідэнтыфікацыі з футболам асобных сацыяльных груп. На пераломе семідзесятых і васьмідзесятых гадоў да агрэсіўна настроеных футбольных балельшчыкаў сталі далучацца скінхеды, якія дапоўнілі лакальны шавінізм фанаў лозунгамі нацыяналістычнага і расісцкага зместу.

Адной з найбольш папулярных канцэпцый высвятлення генэзісу агрэсіўных паводзін сярод спартыўных заўзятараў з'яўляецца макраструктурная перспектыва. Згодна з ёй мяркуецца, што агрэсіўныя балельшчыкі складаюцца з моладзі, якая паходзіць выключна з асяродкаў з нізкім грамадскім статусам, для якой футбольны матч выглядае адзінай аказіяй для самаакрэслення. Падтрымка сваёй каманды на пачатку выконвала кампенсацыйную функцыю для прадстаўнікоў ніжэйшых сацыяльных страт, з'яўлялася своеасаблівай формай уцёкаў ад рэчаіснасці. Але з часам такое выказванне пачуццяў стала прымаць выгляд дэманстрацыі незадаваленя грамадска-эканамічнымі рэаліямі і спробы звярнуць увагу ўсяго супольніцтва на праблемы маргінальных асяродкаў, альбо тых сацыяльных груп, якім патэнцыяльна пагражала маргіналізацыя. Агрэсіўныя паводзіны адпавядалі таксама эмацыйным патрэбам балельшчыкаў. Нягледзячы на фармальную адсутнасць прыналежнасці да канкрэтнага клубу, заўзятары адчувалі сябе членамі акрэсленай супольнасці, да якой належылі разам з футбалістамі. Тыя апошнія выконвалі ў іх паняцці ролю прадстаўнікоў усяго грамадства і эмацыйна звязваліся з клубам, раёнам пражывання, горадам альбо краінай. Поспехі спартоўцаў сімвалічна падымалі прэстыж балельшчыкаў, былі повадам ганарыцца і мець лепшае самапачуцце, чым тое, якое выклікала іх актуальнае сацыяльнае становішча. Паражэнне, наадварот, штурхала да фрустрацыі і правакавала да агрэсіўных паводзін, якія ўжываліся ў адносінах да чужынцаў. Праўда, трэба заўважыць, што мадэль макраструктурнай перспектывы пасля трагічных падзей падчас фінальнага матчу Кубка Еўрапейскіх чэмпіёнаў па футболе паміж камандамі «Ювэнтус» (Турын, Італія) і ФК Ліверпуль (Англія) на брусэльскім стадыёне «Эйзэль» паўстала пад знакам запытання. Справа ў тым, што сярод англійскіх фэнаў знаходзіліся вучні элітарных школ і маладыя прадстаўнікі сярэдняга класу.

Яшчэ адна тэарэтычная перспектыва трактавала агрэсію футбольных заўзятараў як праяву асаблівай маладзёжнай субкультуры. Згодна з ёй, падтрымка вызначанай каманды выглядае як фактар групавой самасвядомасці. Субкультура балельшчыкаў дае пачуццё быцця разам, а таксама павінна супакоіць патрэбы агульнай актыўнасці. Галоўнай прыкметай пачуцця прыналежнасці да субкультуры і фактарам ідэнтыфікацыі яе ўдзельнікаў з'уляецца такі элемент у адзенні, як шалік, што сімвалізуе колеры клубу, хоць у апошні час такія функцыі выконваюць размаляваныя твары і адмыслова пастрыжаныя валасы. Мэты субкультуры заўзятараў не вынікаюць з асаблівасці яе сістэмы каштоўнасцей. Але ўлічваюць аспект варожасці да іншых. Да чужынцаў залічваюцца каманды сапернікаў разам з яе балельшчыкамі, а таксама сімвалы і тыя прадметы, якія належаць да іх. Як падкрэслівае Халіна Сэкула-Квасьневіч (Sekuta-Kwasniewicz H., 1998), у адрозненне ад іншых маладзёжных субкультур, футбольныя фанаты з'яўляюцца толькі сітуацыйнай фармацыяй, футбол не арганізуе ўсяго іх жыцця, не вызначае стылю ўдзелу ў культуры, таму што яны ўключаюцца ў гэтую субкультуру ў акрэсленыя часавыя тэрміны, часцей за ўсё ў дзень гульні. Станіслаў Ванат (Wanat S., 1998), які абапіраецца на тыпы хуліганскіх паводзін на падставе мадэлі М.Сміта, выразняе шэсць канфліктагалічных прычын і сітуацый, якія могуць перайсці ў хуліганскія выбрыкі:

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імені А.А. Куляшова

– эксцэсы, якія разлічаны на эфект (дэманстрацыі, канфрантацыі);
– сітуацыйныя прычыны (забарона ўваходу на стадыён, пагроза паражэння);
– спантанныя эксцэсы (святкаванне перад матчам, святкаванне перамогі).

Дэманстрацыі сустракаюцца даволі часта тады, калі маецца справа са з'яўленнем на спартыўных спаборніцтвах мэтавых праяў, якія робяцца спецыяльна, каб звярнуць увагу публічнасці на палітычныя праблемы (напрыклад, масавае выкарыстанне нацыянальных беларускіх бела-чырвона-белых сцягаў пад час шэрагу футбольных матчаў зборнай Беларусі ў кваліфікацыі да фіналаў чэмпіяната Еўропы і свету). Канфрантацыі вядуць да акцый на стадыёнах, яны маюць дачыненне да такіх традыцыйных сацыяльных фактараў, як расавыя, класавыя, рэлігійныя.

Трэба заўважыць, што спартыўныя спаборніцтвы выклікалі разнастайныя калізіі яшчэ ў старажытнасці. Так, напрыклад, у 532 годзе да н.э. у Канстанцінопале пад час гонак на калясніцах узніклі гіганцкія сутычкі паміж тысячамі гледачоў, якія прыйшлі на стадыён. Толькі пасля вайсковай інтэрвенцыі ўдалося супакоіць агрэсію натоўпу, тым не менш у выніку крывавых боек было забіта каля 30 тыс. чалавек. У 59 годзе н.э. падобныя эксцэсы мелі месца ў Пампеях, калі на арэну, дзе адбываліся бойкі гладыятараў, кінуліся разгарачаныя гледачы. Здарэнне было настолькі сур'ёзным, што ім заняўся нават Рымскі сенат, які ў выніку забараніў арганізацыю падобных спаборніцтваў у гэтым горадзе тэрмінам на дзесяць гадоў. Дарэчы, само паняцце «хуліганства» паходзіць ад прозвішча аднаго ірландца Эдварда Хулігана, які жыў у XVIII ст. у Лондане. Ён і яго сям'я былі шырокавядомыя як злачынцы. Згодна з азначэннем, якое даецца ў «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы», – «хуліган» – гэта той, «хто груба парушае грамадскі парадак, займаецца хуліганствам», а «хуліганства», адпаведна – «грубае парушэнне правіл грамадскага парадку; паводзіны, у якіх заключаецца непавага да грамадства, да чалавека».

Дарэчы, філосафы спорту вызначаюць і размяжоўваюць паміж сабой такія тэрміны як «агрэсія» і «гвалт». Навукоўцы сёння аналізуюць папярэдні стан агрэсіі і гвалту, а таксама агрэсію і гвалт сярод атлетаў, агрэсію і гвалт сярод гледачоў і, акрамя таго, перадумовы ў абмежаванні агрэсіі і гвалту.

Агрэсія на спаборніцтвах характарызуецца наступным чынам. Яна мае родасныя сувязі з адносінамі ў спорце, што з'яўляецца галоўным у яе вывучэнні, праўда, з супярэчлівымі вынікамі ў дачыненні агрэсіўнасці атлетаў розных спартыўных дысцыплін з тымі індывідамі, якія не займаюцца спортам. Удзел у змаганнях дае магчымасць прадэманстраваць агрэсіўныя паводзіны падчас гульні, а таксама праз фізічнае знясіленне атлетаў зафіксаваць катарсічны эфект. Нешта падобнае адбываецца і сярод гледачоў. Там ізноў прысутнічаюць формы катарсісу ў выглядзе эмацыйнага ўключэння заўзятараў у падзею (H.Haag, 1994).

Гвалт характарызуецца наступнымі тэзамі. Калі аналізаваць спаборніцтвы сярод атлетаў больш высокага ўзроўню, то яго ўзрастанне крытыкуецца сёння бесперапынна. Як гэта ўстаялася, фізічны гвалт з мэтаю ўздзеяння на суперніка без прамога выканання мэтаў памяншаецца на ўзроўні атлетаў вышэйшага класу. Тым не менш, у той самы час агрэсія з мэтай зрабіць уздзеянне на апанента з карысцю для сябе ўзрастае. Такое развіццё падзей адбываецца як наступства прафесіяналізацыі і камерцыялізацыі. Гвалт як фізічнае спаборніцтва можа быць прадстаўлены ў структуры спецыфічна-спартыўнай дысцыпліны як знак і таму адпавядае правілам. Тым не менш, спорт знікае ў маральнасці, калі не супадае са спецыфічнымі правіламі спартыўнай дысцыпліны і нормамі агрэсіўнасці, брутальнасці і распаўсюджвання падману. Цэнтральнай праблемай на спартыўных спаборніцтвах становіцца павелічэнне агрэсіўнасці з мэтай перамогі за ўсялякі

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

кошт. Гэта можа быць вынікам змянення норм у накірунку да Foul play (брутальная, несумленная гульня), фізічнага і вербальнага спаборніцтва. Агрэсіўнасць гледачоў можа таксама ўплываць на спартыўныя падзеі. Гэта перш за ўсё сацыяльная праблема, якая асабліва датычыца маладых людзей. Атлеты і афіцыйныя асобы ствараюць належныя варункі ў спорце, што мае непасрэднае дачыненне да яго прыхільнікаў. Дзеля таго, каб павесці спорт у патрэбным накірунку, неабходна ранняя і ўсебаковая адукацыя згодна з прынцыпамі Fair play (чыстая, сумленная гульня).

У цывілізацыйным і культурным вымярэнні спорт павінен стаць прыкладам, узорам для свету, павінен кіравацца ідэяй Fair play, супрацьстаяць агрэсіі. На жаль, рэчаіснасць сведчыць пра нешта іншае. Як падкрэсліў Ежы Касевіч (Kosiewicz J., 1996), у грамадстве, што пранізана паталогіяй, спорт як важны яго культурны элемент не можа быць вольным ад дэвіяцыі, таму што яна (дэвіяцыя) з'яўляецца вынікам хваробы ўсяго сацыяльнага арганізму).

Павышэнне грамадскага інтарэсу да спартыўнай дзейнасці на працягу XX ст. можна разглядаць і аналізаваць з некалькіх бакоў. Напрыклад, калі спасылацца на ўжо цытаванага Х.Артэгу-і-Гасэта, то адным з важных момантаў тут з'яўляецца рэалізацыя вымушанага, непазбежнага высілку, што заўсёды дыктуецца пэўнымі абставінамі, і лепш за ўсё гэта праяўляецца ў дзейнасці, якую прынята называць працай, але лепшы прыклад марных намаганняў (без мэты) дае спорт. Праўда, крыху далей іспанец такім жа чынам характарызуе і філасофію: «Філасофія таксама ёсць ні чым іншым, як спорт. Яна ніколі не была неабходнасцю. Філасофія параўноўваецца са свабодным высілкам». Згодна з гэтым, спорт, хоць і марная, але праца з усімі атрыбутамі прафесійнай дзейнасці.

З іншага боку, спартыўная дзейнасць атрымоўвае сацыяльныя імпульсы для свайго развіцця і пашырэння менавіта за кошт магчымасці свабоднага выхаду энэргіі (у другіх варыянтах – агрэсіі), якая ўласціва чалавеку і чалавечаму грамадству. Так было заўсёды. Толькі з развіццём цывілізацыі мяняліся формы, у якіх адбывалася рэалізацыя гэтай агрэсіўнасці. Усё пачыналася з палявання і выкрадання жанчын, сёння ж мы бачым амаль аналагічнае, – адрозненне толькі ў тым, што зараз знішчаецца навокал усё: людзі, крамы, аўтамабілі. Грамадства спрабуе ў рамках сваёй культуры і свайго разумення супрацьстаяць гэтаму. На спартыўныя спаборніцтвы сталі патрабавацца паліцэйскія сілы для аховы парадку ад магчымай хвалі вандалізму. Але і тут не абыходзіцца без трагедый. У студзені 1998 года ўсю Польшчу ўскалыхнула забойства паліцыянтам у горадзе Слупску 13-гадовага хлапчука, які разам з групаю мясцовых заўзятараў вяртаўся дадому пасля баскетбольнага матчу.

Увогуле, гвалт, агрэсія і хуліганства – неад'емныя атрыбуты чалавечага грамадства. Спорт у гэтым выпадку не выключэнне. Вытокі падобных эксцэсаў пачынаюцца з далёкіх часоў мінуўшчыны.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. – Мн.: БелЭн, 1996. – С. 726.
2. ***Мяло К.*** Уроки Эйзеля // Иностранная литература. – 1987. – № 1. – С.177-185.
3. ***Ортега-и-Гассет Х.*** О спортивно-праздничном чувстве жизни // Философские науки. – 1991. – № 12. – С.137-152.
4. ***Fiut I.S.*** Sport – czyli poszukiwanie lepszego świata // Logos i etos Polskiego olimpizmu. – Kraków: Wydawnictwo Naukowe – Fall, Studio FALL, 1994. – S.41-48.
5. ***Gorący A.*** Chuligaństwo na stadionach // Sport w procesie integracji europejskiej. Międzynarodowe sympozjum. – Warszawa: Akademia Wychowania Fizycznego, 1998. – S.285-291.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

6. ***Haag N.*** Theoretical Foundation of Sport Science as a Scientific Discipline. Contribution to a Philosophy (Meta-Theory) of Sport Science. – Schomdorf: Hermann, 1994. – 167p.
7. ***Heinemann K.*** Wprowadzenie do socjologii sportu. – Warszawa: COM SNP, 1990. – 298 s.
8. ***Karolczak-Biemacka B.*** Problem agresji w sporcie // Logos i etos Polskiego olimpizmu. – Kraków: Wydawnictwo Naukowe – Fall, Studio FALL., 1994. – S.105-118.
9. ***Kosiewicz J.*** O patologii społecznej w sporcie // Wychowanie Fizyczne i Zdrowotne. – 1996. – № 4. – S.204-206.
10. ***Lorenz K.*** Tak zwane zło. Warszawa, 1995; цыт. na: Fiut I.S. Sport – czyli poszukiwanie lepszego świata // Logos i etos Polskiego olimpizmu. – Kraków: Wydawnictwo Naukowe – Fall, Studio FALL, 1994. – S.41-48.
11. ***Sekuła-Kwaśniewicz H.*** Teorie socjologiczne w wyjaśnianiu agresywnych zachowań kibiców sportowych // Sport w procesie integracji europejskiej. Międzynarodowe sympozjum. – Warszawa: Akademia Wychowania Fizycznego, 1998. – S.269-276.
12. ***Wanat S.*** Przemoc w sporcie – psychospołeczne modele interpretacji agresji // Sport w procesie integracji europejskiej. Międzynarodowe sympozjum. – Warszawa: Akademia Wychowania Fizycznego, 1998. – S.277-284.

## SUMMARY

*Some tendencies of cultural development in the society conceming sports activity are revealed in the article. Basing his theories upon various theoretical and empirical material and works of well-known philosophers H.Ortega Gasset, K.Lorenz the author considers violence, aggression and hooliganism to originate from ancient times and to be inalienable attributes of human society. It is noted in the article that sport vividly demonstrates those kinds of deviation which bring tension into the social life. In this connection the author analyses football fans" line of coduct as they are in fact the best organized and at the same time the most numerous and the most dangerous social group, quite a considerable bibliography being dedicated to this problem.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова